**● ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ**

# ТРЫ ПАДЗЕІ НАРОДНАГА ЛІТАРАТУРНАГА МУЗЕЯ ЎНІВЕРСІТЭТА ДА 75-ГОДДЗЯ ВЫЗВАЛЕННЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

***Сёлета адзначаецца 75-годдзе вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Па ўсёй краіне праходзяць урачыстыя мерапрыемствы, прымеркаваныя да гэтай важнай даты. Наш універсітэт не стаў выключэннем. Напрыклад, увесну па ініцыятыве народнага літаратурнага музея ВДУ імя П. М. Машэрава і кафедры літаратуры адбыліся наступныя цікавыя падзеі.***

**«НІКОЛІ НЕ ЗАБУДЗЕМ»**

Так называлася выстава ў народным літаратурным музеі нашай альма-матар. Як расказала яго загадчык, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры літаратуры, сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтка Вольга Іванаўна Русілка, асноўная мэта экспазіцыі — паказаць, як адлюстравана вайна ў творчасці айчынных пісьменнікаў і яшчэ раз нагадаць пра мужнасць і гераізм беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Аўтары, творы якіх прадстаўлены на выставе, у асноўным і самі з'яўляюцца прадстаўнікамі ваеннага пакалення. У гэтым можна ўпэўніцца, разглядзеўшы франтавыя фотаздымкі пісьменнікаў.





У экспазіцыі можна пабачыць кнігі «Я з вогненнай вёскі» Алеся Адамовіча, Янкі Брыля і Уладзіміра Калесніка, «Хатынская аповесць» Алеся Адамовіча, «Мінскі напрамак» Івана Мележа, «Суд у Слабадзе» Віктара Казько, «Птушкі і гнёзды» Янкі Брыля, «Ніколі не забудзем» (рэдактар Янка Маўр), зборнік апавяданняў і аповесцей «Братэрства» Тараса Хадкевіча, што выйшаў у першыя пасляваенныя гады, і інш.

— У цэнтры выставы — арыгінал газеты «Раздавім фашысцкую гадзіну» за сакавік 1942 года. Гэта адзін з самых першых нумароў сатырычнага выдання. Унікальны экземпляр мне перадаў галоўны на той час рэдактар часопіса «Вожык» Алесь Пісьмянкоў. Гэтым экспанатам можна ганарыцца, — зазначыла Вольга Іванаўна.



**ТВОРЧАЯ СУСТРЭЧА З ВУЧНЯМІ І НАСТАЎНІКАМІ ВІЦЕБСКАЙ СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЫ № 28**

Увесну юнакі і дзяўчаты сярэдняй школы № 28 разам з педагогамі завіталі ў літаратурны музей на творчую сустрэчу з В. І. Русілка. У гэты дзень яны маглі паслухаць і абмеркаваць вершы на ваенную тэматыку, разгадаць аўдыёкрыжаванкі і паўдзельнічаць у віктарыне, якую падрыхтавала паэтка.

Акрамя таго, Вольга Іванаўна прачытала аўтарскія вершы, напісаныя ў юнацкія гады. Атрымалася цікава, а галоўнае — шчыра. Дарэчы, вучні зацікавіліся магчымасцю атрымання вышэйшай адукацыі ў ВДУ імя П. М. Машэрава, таму сустрэча мела і прафарыентацыйны характар.

**ЛІТАРАТУРНА-МУЗЫЧНАЯ ПРАГРАМА «СМОРОДИНА»**

Імпрэза прайшла ў навуковай бібліятэцы нашага ўніверсітэта ў сярэдзіне мая. Арганізатарамі выступілі загадчык кафедры літаратуры нашай альма-матар, член Саюза пісьменнікаў Беларусі і Саюза пісьменнікаў Расіі Алена Уладзіміраўна Крыклівец, капітан другога рангу запасу, член Саюза пісьменнікаў Расіі Алег Вітальевіч Сяшко, удзельнік ваеннага канфлікту ў Нагорным Карабаху, лаўрэат шматлікіх конкурсаў і фестываляў ваенна-патрыятычнай песні Віктар Леанідавіч Пахомчык.

— Свое название мероприятие получило неслучайно. В славянской мифологии имелось представление о реке Смородине, которая являлась границей между миром мертвых и миром живых. Кроме того, в моих стихах и стихах Олега Сешко присутствует образ смородины (куста) как символа дома. А рифма «родина — смородина», думаю, известна многим, — адзначыла Алена Уладзіміраўна.

Удзельнікі літаратурна-музычнай праграмы змаглі падзяліцца сваімі думкамі і пачуццямі з дапамогай кранальных вершаў і песень. А слёзы на вачах у прысутных падчас выступлення Віктара Пахомчыка сведчылі пра тое, што сустрэча атрымалася шчырай!

**Алеся ДАЎЖЭНКА, студэнтка 3-га курса ФлФ.**

**На здымках:** падчас імпрэзы «Смородина» *(уверсе)*, школьнікі ў літаратурным музеі ВДУ *(унізе)*, газета «Раздавім фашысцкую гадзіну» *(злева)*.

**Фота Вольгі ЛУЗГІНОЙ.**